# *ХРОНИКА НАУЧНОЙ ЖИЗНИ*

## ОНОМАСТИКА В СМОЛЕНСКЕ И ВИТЕБСКЕ: ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ ИССЛЕДОВАНИЯ

### *МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ*

***(Смаленск, 17 сакавіка 2015 года)***

Правядзенне канферэнцыі ў Смаленску, прысвечанай праблемам анамастыкі, стала традыцыйнай падзеяй як для расійскіх, так і для беларускіх навукоўцаў. Ужо сама цырымонія адкрыцця канферэнцыі, дзе, акрамя кіраўніцтва ВУЗа, удзельнікаў прывіталі кіраўнік аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі М.В. Куцко і кіраўнік міжнароднага аддзела Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта Р.В. Бялюцін, засведчыла, што галоўнай мэтай арганізатараў было зладзіць беларуска-рускае супрацоўніцтва.

Пленарнае пасяджэнне распачалося аповедам непасрэднага арганізатара канферэнцыі і заснавальніка смаленскай анамастычнай школы І.А. Каралёвай пра станаўленне даследаванняў анамастыкі ў Смаленску. Першая канферэнцыя «Ономастика в Смоленске: проблемы и перспективы исследования» адбылася ў 2008 годзе і была лакальнай, але грунтоўныя мясцовыя даследаванні вынікам мелі заяўленую ў 2010 годзе Смаленскую анамастычную школу, прызнаную сёння і ў Расіі, і за мяжой. Канферэнцыі пад кіраўніцтвам І.А. Каралёвай ладзіліся ў 2011 і 2013 г. У апошняй узялі ўдзел віцебскія даследчыкі, тады і з'явілася ідэя наладзіць супрацоўніцтва смаленскай і віцебскай анамастычных школ. Плёнам сумеснай працы пад кіраўніцтвам І.А. Каралёвай і Г.М. Мезенкі стала выдадзеная ў 2014 г. расійска-беларуская манаграфія «Смоленщина и Витебщина в языковых и культурных контактах: история и современное состояние», падораная арганізатарамі ўдзельнікам канферэнцыі. Працяг супрацоўніцтва адзначыла сёлетняя канферэнцыя.

На жаль, заснавальнік віцебскай школы анамастыкі Г. М. Мезенка па стане здароўя не змагла паўдзельнічаць у мерапрыемстве, таму аповед пра станаўленне віцебскай анамастычнай школы быў прадстаўлены Т.П. Слесаравай. Віцебская анамастычная школа заснавана ў 1996 г., хаця фарміраванне накірунку даследавання пачалося ў 80-я гг. з вывучэння ўрбананіміі. Станаўленне школы звязана з выкананнем шэрагу навуковых праектаў, прысвечаных даследванню Беларускага Паазер'я ў прыватнасці, а таксама з працай дзевяці Міжнародных навуковых канферэнцый «Белорусско-русско-польское сопоставительное языкознание, литературоведение, культурология». На сучасным этапе ў межах віцебскай анамастычнай школы працуюць 16 даследчыкаў, якія акрамя навуковых выданняў падрыхтавалі і выдалі шэраг матэрыялаў, што спрыяюць вывучэнню праблем анамастыкі ў межах школьных і ўніверсітэцкіх курсаў. Дыяпазон накірункаў даследавання школы даволі шырокі: пытанні беларускай тапаніміі і антрапаніміі, перш за ўсё Беларускага Паазер'я, у сінхраніі і дыяхраніі, параўнальна-супастаўляльнае вывучэнне назваў унутрыгарадскіх аб'ектаў Беларусі, Кітая, Балгарыі, Польшчы і інш. краін, пытанні віканіміі, эклезіяніміі, вывучэнне ролі анімічных адзінак у стварэнні мастацкіх вобразаў у прозе і паэзіі, а таксама разгляд анімічнага матэрыялу ў аспекце ўзаемадзеяння мовы і культуры.

Пасля рэпрэзентацыі дзвюх школ анамастыкі на пленарным пасяджэнні Ю.М. Галкоўская прадставіла даклад «Ценностные ориентиры на витебско-смоленском пограничье: сопоставительный аспект», у якім былі разгледжаны каштоўнасныя сістэмы жыхароў памежжа праз прызму прыярытэтаў іменавання ў пачатку XXI ст. В.В. Іванова прадэманстравала ўкараненне навукі ў школьнае рэчышча, яе выступ «Из опыта работы научного общества учащихся «Малая Академия»: ономастический аспект» датычыўся практычных аспектаў вывучэння анамастыкі вучнямі школы-інтэрната сярэдняй агульнай адукацыі з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў імя Кірылы і Мяфодзія. Т.І. Сінкевіч у дакладзе «История озера Бездна» закранула не толькі лінгвістычны, але этнаграфічны і культуралагічны аспекты. Д.В. Буцееў распавёў пра асаблівасці неафіцыйных узонімаў горада – «Неофициальные наименования учебных заведений г. Смоленска». У.М. Генкін у аповедзе «Оппозиция как элемент системности региональной топонимии (на материале топонимии Витебщины и Смоленщины)» прааналізаваў розныя тыпы тапанімічнай апазіцыі, якая праяўляецца як на эксплiцытным, так і на імпліцытным узроўні. І.В. Данілава падзялілася вопытам працы з замежнымі студэнтамі. У дакладзе «Антропонимы в курсе русского языка как иностранного в высшей школе» даследчыца распавяла пра асаблівасці ўспрымання славянскіх імёнаў замежнымі навучэнцамі праз прызму ўласнага іменавання. У завяршэнні пленарнага пасяджэння прагучаў адзіны беларускамоўны даклад С.М. Лясовіч «Прэцэдэнтныя онімы ў паэзіі Сяргея Панізніка», у якім імя было разгледжана як культурны знак.

Далейшая праца канферэнцыі прайшла па чатырох секцыях «Проблемы топонимики», «Проблемы антропонимики», «Имя собственное в художественном тексте» і «Общие вопросы» изучения имён собственных», якія акрэслілі найбольш прыярытэтныя напрамкі анамастычных даследаванняў віцебскай і смаленскай школы. Пры невялікай колькасці ўдзельнікаў варта адзначыць прадуктыўную працу канферэнцыі з перспектывай на будучае супрацоўніцтва. Абмен вопытам віцебскіх і смаленскіх даследчыкаў – узор варты пераймання. Прыналежнасць Полаччыны да віцебскага рэгіёна мае перспектывай далучыцца да працы віцебскай навуковай школы з мэтай папаўнення скарбонкі рэгіянальнай анамастыкі.

***С.М. Лясовіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***